Просто хорошая газета

Отдушина

12+

№12 (811) 18 марта 20

…ит один раз в не… …вана 18 октября … года …датель УП «… Слонимская» ГАЗЕ… …УГА



Узнагарода

ДЗІЦЯЧЫ ХАКЕЙ

Дзятлаўскія школьнікі — найбольшыя хакейныя энтузіясты на Гродзеншчыне

З 26 да 28 лютага былі гасцінна расчынены дзверы Лядовага палаца Ліды для юных аматараў хакею з шайбай. Спартсмены прыехалі сюды, каб вызначыць лепшую каманду Гродзенскай вобласці ў спаборніцтвах на прызы клуба «Залатая шайба» сярод каманд раёнаў, якія не маюць штучнага лёду.

Права ўдзельнічаць у гэтым турніры мелі дзеці, якія нарадзіліся ў 2006-2008 гадах. Сёлетняя зіма не дала магчымасці заліць лёд на адкрытых пляцоўках, а ездзіць на трэніроўкі ў Лядовыя палацы затратна і па часе, і па сродках, да таго ж не заўсёды ў іх маюцца свабодныя «вокны», і, як правіла, для прыезджых арэнду лёду даваляюць ці вельмі рана, ці вельмі позна. І трэба мець вялікае жаданне, каб на трэніроўку з пад`ездам і ад`ездам патраціць сем-восем гадзін ды пры гэтым другі раз ахвяраваць і часткай свайго сну.

Каманд сабралася ўсяго дзевяць. А былі ж гады, калі толькі адзін ці два раёны не ўдзельнічалі ў такіх хакейных святах.

Пасля святочнай урачыстай цырымоніі адкрыцця пры амаль цалкам запоўненых трыбунах вучнямі лідскіх школ, адмыслова запрошанымі дзеля гэтага, на лёд выйшлі мінулагоднія пераможцы рэспубліканскіх спаборніцтваў — каманда «Алмаз» з Дзятлава і юныя спартсмены з Астраўца.

З першых хвілін ініцыятыву захапілі дзятлаўчане. Лік хутка рос на іх карысць. Фінальная сірэна зафіксавала перамогу «Алмаза» з лікам 12:1. Дзятлаўчане прадэманстравалі канькавую падрыхтоўку, дасягнуць якой здолелі, не шкадуючы вольнага часу, сродкаў і сіл, штотыдзень выязджаючы на трэніроўкі на штучны лёд у Гродна, Баранавічы, Ліду. Менавіта таму ім лёгка далася перамога і над наступным супернікам. У вароты гульцоў з Карэлічаў закінулі 11 шайбаў, захаваўшы свае «на замку».

У другой падгрупе лідарства захапілі смаргонцы, даволі лёгка і пераканаўча абыграўшы каманды з Мастоў і Свіслачы.

Найбольш роўная і ўпартая барацьба за лідарства склалася ў трэцяй падгрупе, дзе неаднаразовыя пераможцы і прызёры абласных турніраў, хакеісты з наднёманскай вёскі Орля Шчучынскага раёна, спачатку ва ўпартай і роўнай барацьбе адолелі навагрудчан, а пасля перамаглі і ашмянцаў.

Але самая цікавая і прыгожая, са шматлікімі галявымі момантамі гульня, якая ўсе 30 хвілін (гульні складаліся з двух перыядаў па 15 хвілін) трымала ў напружанні заўзятараў, адбылася ў апошні, трэці дзень спаборніцтваў паміж камандамі «Алмаз» і смаргонцамі. На першых хвілінах парушаюць правілы і выдаляюцца на дзве хвіліны адзін за другім дзятлаўчане. Застаўшыся ў меншасці, тры хакеісты адчайна адбіваюцца, але ўсё ж шайба трапляе ў іх вароты. Ягор Салавей выроўнівае лік, і гульня надоўга перамяшчаецца ў зону смаргонцаў, але, як часта бывае, «заіграўшыся», дзятлаўчане прапусцілі выхад сам-насам Марата Будкевіча, і лік зноў стаў на карысць Смаргоні.

На пачатку другога перыяду самы юны (2009 г.н.) ігрок «Алмаза» Міхась Петрыкевіч робіць лік 2:2. З гэтага часу пачалася сапраўдная асада варотаў смаргонцаў. Некалькі разоў шайба трапляе то ў штангі, то ў перакладзіну, то ў шлем варатара, то ляціць чуць-чуць міма. І нарэшце, калі да канца гульні заставалася ўсяго 36 секунд, Раман Котаў завяршае выхад на вароты трапным і хвосткім кідком у левую «дзявятку». Тут жа, пасля ўкідвання ў цэнтры, шайба зноў трапляе да яго. Раман абыгрывае аднаго за другім амаль усіх супернікаў і забівае чатыры шайбы.

Смаргонцы пакідалі пляцоўку ў слязах. Трэнер супакойваў іх як мог. Адным з іх аргументаў было тое, што цяпер неабходна абыграць хлопцаў у Орлі, а яны, магчыма, змогуць адолець дзятлаўчан. Тады ўсё вырашыцца па розніцы забітых і прапушчаных шайбаў.

«Алмаз» усё зрабіў па-іншаму. У вароты арлянцаў забіў 13 шайбаў, а ў свае прапусціў толькі дзве. А вось смаргонцы перамаглі іх ледзьве-ледзьве. Лік 6:5 сведчыць пра тое.

4-6-я месцы размеркаваліся адпаведна наступным чынам: Навагрудскі, Карэліцкі, Свіслацкі раёны. Юным астравецкім, ашмянскім і мастоўскім хакеістам прыйшлося быць у гэтым сезоне ў канцы турнірнай табліцы.

Валерый ПЕТРЫКЕВІЧ, аматар хакею з шайбай з г. Дзятлава

ФОТА З АРХІВА АЎТАРА

Пазнай сябе на фота

Паважаныя чытачы! Пазнавайце на старых фотаздымках сябе, сваіх знаёмых і блізкіх і тэлефануйце нам: 8 (01562) 29-999, 8 (029) 133-04-21 у працоўныя дні з 9:30 да 17:30. Найбольш цікавыя расповеды пра герояў здымкаў будуць надрукаваны ў газеце, а іх аўтары атрымаюць запрашальныя квіткі на спектаклі Слонімскага драматычнага тэатра.


Рыбак

На фотаздымак камсамольскіх актывістаў 1986 года, надрукаваны ў мінулым нумары газеты, першым адгукнуўся адзін з яго герояў, Мікалай Лысуха.

— Я тут у верхнім радзе трэці справа стаю. Самы малы. Першы крайні справа ў гэтым радзе — Крывашэеў Аляксандр, чацвёрты злева — Жук Юра, — расказаў Мікалай Уладзіміравіч.

Наша чытачка Ніна Іванаўна, былая работніца Слонімскага быткамбіната, пазнала колішняга дырэктара быткамбіната, а потым дырэктара рынку Аляксея Капейкіна, які сядзіць у першым радзе другі злева.

— У першым радзе справа другі сярод мужчын сядзіць колішні актывіст камуністычнага руху ў Заходняй Беларусі Кавалеўскі, — распавёў яшчэ адзін наш чытач, Уладзімір Рабцэвіч.

Мікола КАНАНОВІЧ

ФОТА З АРХІВА «ГС»

СЛОНИМСКИЙ ПЕДАГОГ ВЫШЛА В ФИНАЛ ОБЛАСТНОГО ЭТАПА КОНКУРСА «УЧИТЕЛЬ ГОДА»

Учитель биологии СШ №3 Слонима Татьяна Амшей стала победителем второго тура областного этапа конкурса профессионального мастерства педагогических работников «Учитель года» и вышла в третий тур конкурса.


Татьяна Амшей

Всего во втором туре областного этапа конкурса «Учитель года» участвовало 50 педагогов Гродненщины, в том числе два педагога из Слонимского района — учитель физики Новодевятковичской СШ Владимир Зимич и учитель биологии СШ №3 Татьяна Амшей.

Все участники второго тура провели уроки в незнакомых классах и мастер-классы для педагогов.

В номинации «Химия, биология» слонимский учитель биологии Татьяна Амшей по итогам конкурса вышла в финал и стала участницей третьего тура.

В третьем туре каждому педагогу предстоит поучаствовать в психолого-педагогическом тестировании, публично выступить на сцене на заданную тему, провести на сцене мини-урок и публично представить систему педагогической деятельности.

Жанна ИВАНОВА

ФУТБОЛ

ФК «Слоним 2017» начнёт чемпионат в Пинске

В понедельник, 16 марта, в столичном Доме футбола прошла жеребьёвка чемпионата Беларуси среди команд первой лиги на сезон 2020 года. ФК «Слоним 2017» начнёт соревнования 25 апреля в Пинске.



В этом году в первой лиге чемпионата Беларуси примет участие 14 футбольных клубов. Стало известно, что команда, занявшая последнее место в чемпионате, будет играть в переходных матчах с командой, занявшей третье место во второй лиге.

В Слониме футбольный сезон начнётся 2 мая матчем с ФК «Орша».

1 тур

Гомель – Нафтан (Новополоцк)
Локомотив (Гомель) – Химик (Светлогорск)
Крумкачы (Минск) – Гранит (Микашевичи)
Арсенал (Дзержинск) – Ошмяны-БГУФК
Спутник (Речица) – Сморгонь
Волна (Пинск) – Слоним 2017
Орша – Лида

2 тур

Нафтан (Новополоцк) – Лида
Слоним 2017 – Орша
Сморгонь – Волна (Пинск)
Ошмяны-БГУФК – Спутник (Речица)
Гранит (Микашевичи) – Арсенал (Дзержинск)
Химик (Светлогорск) – Крумкачы (Минск)
Гомель – Локомотив (Гомель)

Сергей БУЗУН
ФОТО ИЗ АРХИВА «ГС»

МИНИ-ФУТБОЛ

СЛОНИМСКИЙ «ФОРСАЖ» В ФИНАЛЕ ПОБЕДИЛ

В воскресенье, 15 марта, в ДЮСШ №1 Слонима в первом финальном матче первенства Гродненской области по мини-футболу слонимский «Форсаж» победил.

МФК «Форсаж» (Слоним) — МФК «Электросети» (Лида) – 3:2 (2:2)

«Форсаж» (Слоним): Сергей Берг, Денис Куцко, Юрий Левошик, Вадим Спасюк, Олег Герасимчик, Андрей Молчанов, Александр Дегиль, Алексей Чернодаров, Владислав Берг, Вильгельм Берг, Виктор Берг, Александр Комлев, Владимир Корней.

Матч проходил в бурной атмосфере. Что на трибуне, что на площадке. На протяжении всей встречи на трибуне не умолкал барабан, привезённый лидскими болельщиками. На площадке шла борьба, достойная финала. Страсти были накалены до предела. Игра проходила на грани фола с множеством нарушений правил с обеих сторон.



Первыми открыли счёт забитым мячам хозяева. Отличился Вадим Спасюк — 1:0. Через некоторый промежуток времени гости выравняли ситуацию — 1:1. В дальнейшем Виктор Берг вывел свою команду вновь вперёд — 2:1, и долгое время слонимские футболисты удерживали перевес в счёте. Лидчане даже не сумели реализовать 10-метровый штрафной удар. Но всё же в концовке первого тайма им удалось поразить ворота слонимчан — 2:2.

После перерыва Олег Герасимчик сильным и точным ударом вывел «Форсаж» вперёд — 3:2. А в конце встречи слонимчанам в течение двух минут — из-за удаления — втроём пришлось отбиваться от наседавших на ворота противников. У них это получилось, и они победили в тяжелейшем матче.

Теперь их ждёт ответная встреча в Лиде.

Сергей БУЗУН
ФОТО АВТОРА

ПОЗДРАВЛЕНИЯ В «ГС» ЗАПОМНЯТСЯ ВАМ НАДОЛГО



ДЕНЬ РОЖДЕНИЯ!

Сразу два знаковых события мы отпразднуем в марте: фотостудии «Контрабас» уже два года, и ровно год назад в нашем городе мы открыли производство печати на холстах!


ФОТО ИЗ АРХИВА АВТОРА

Множество ярких и незабываемых событий произошло за это время! Более 1000 героев наших фотосессий пополнили свои семейные архивы нашими фотографиями. Несколько сотен улыбок и сияющих глаз вы видели, вручая холсты своим любимым и друзьям!

Три потока выпускников выпорхнули из гнезда нашей фотошколы на базе фотостудии «Контрабас». Теперь мы гордимся творчеством наших талантливых учеников, глядя на то, что наши педагогические труды взрастили свои плоды! Всех вас любим, обнимаем и благодарим!

Спасибо вам за то, что были с нами все эти годы! Спасибо за эмоции, за теплоту и колоссальную энергетику! Вместе мы сделаем мир лучше!

Ольга НОВГОРОДСКАЯ

БАСКЕТБОЛ

В Слониме прошёл турнир по баскетболу памяти Леонида Журовича


ФОТО АВТОРА

14-15 марта в ДЮСШ №1 Слонима состоялся открытый любительский турнир по баскетболу среди ветеранов памяти Леонида Журовича.

О Журовиче

Журович Леонид Матвеевич работал учителем физкультуры и начальных классов в Новодевятковичской СШ, директором Раховичской СШ. В разное время тренировал команды этих школ по баскетболу, которые были сильнейшими в Слонимском районе.

Был активным участником соревнований по баскетболу, играл за сборную области на первенстве республики. Вместе со своими воспитанниками неоднократно становился призёром областного чемпионата.

Внёс наибольший вклад в развитие и популяризацию баскетбола на Слонимщине.

Являлся организатором и участником районного турнира «Стритбол для всех». Многие его воспитанники стали работать в спортивной и педагогической отрасли Республики Беларусь, продолжая начатое учителем.

Игра

В турнире приняло участие четыре команды: из Минска, Лиды, Несвижа и Слонима.

В субботу, 14 марта, первыми на площадку вышли команды Слонима и Лиды. Как ни старались слонимские баскетболисты, но лидчане, ведомые год назад завершившим профессиональную карьеру Александром Кудрявцевым, были сильнее — 63:55.

Затем команда из Лиды победила соперников из Несвижа — 54:48.

В завершение игрового дня немного задержавшиеся в дороге спортсмены из Минска, как говорится, с колёс не оставили ни единого шанса ни Слониму — 79:46, ни Несвижу — 82:47.

Итоги

В заключительных играх воскресного дня велико было желание у хозяев турнира победить в матче с командой из Несвижа. И поначалу они вели в счёте. Но физическая подготовка оказалась лучше у несвижских баскетболистов, и они были сильнее в конце матча. 58:35 завершился этот поединок в пользу приезжих спортсменов. Они заняли третье место в соревнованиях.

Очень напряжённой и упорной была заключительная встреча турнира между Минском и Лидой. Решалась судьба первого места. Но всё же победа досталась более молодой команде из Минска со счётом 79:61.

Завершился турнир раздачей наград и памятных призов. Осуществил это Алексей Журович — сын выдающегося тренера и учителя.

Лучшим игроком турнира признан Александр Кудрявцев.

Корреспондент задал несколько вопросов бывшему игроку «Цмокаў» и национальной сборной Александру Кудрявцеву.

— Почему Вы, уроженец Минска, выступаете за Лиду?

— Просто продолжаю играть в баскетбол. Со многими ребятами из Лиды знаком больше двадцати лет. Играл за них всегда, когда было свободное время.

— Вы занимались баскетболом в Минске, а игровую карьеру начали в Гродно. Может, с этим связано появление лидских ребят в жизни?

— В те времена, когда учился в Гродно, я выступал за гродненскую команду, за университет, тогда и пересёкся со многими лидскими ребятами.

— Какие самые яркие впечатления запомнились за длительную игровую карьеру?

— Баскетбол в каждой игре даёт какие-то яркие впечатления и эмоции. Запомнилось, что не удалось выступить в финальной части чемпионата мира и Европы.

Интервью

Одним из учеников Леонида Журовича является Дмитрий Близнюк, который на турнире был играющим тренером слонимской команды. Корреспондент «ГС» встретился с ним и попросил рассказать об учителе и о себе.

— В начале 80-х Леонид Матвеевич прибыл в Новодевятковичскую школу. И с этого момента у нас начался в школе баскетбольный бум. Он привил нам большую любовь к этому виду спорта. Зарядил нас своей энергией. Под его руководством мы успешно выступали на областных соревнованиях. Все поколения новодевятковичских баскетболистов, которые были и при нём, и потом, стали продолжателями его дела, – сообщил ветеран слонимского баскетбола.

— Расскажите о себе. Какие у Вас были спортивные достижения?

— В 2006 и 2009 годах я со своими партнёрами из Новодевятковичей стал победителем Сельских игр по стритболу в Стайках.

— А какие тренерские достижения?

— В 2013 году мы были вторыми на республиканских соревнованиях. В 2014 году выиграли школьную баскетбольную лигу. В 2019 году в Молодечно участвовали в спартакиаде Союзного государства и заняли почётное третье место.

— А самое главное достижение — это сын?

— Влад Близнюк — профессиональный баскетболист, игрок дубля минских «Цмокаў».

Сергей БУЗУН

Слонимчане стали победителями международного конкурса «Музыки свет»


Анастасия Бортко, Артём Ваниславчик, Валерия Рожко с преподавателями Ольгой Жегалик и Дарьей Дожиной


Елена Снитко и концертмейстер Ульяна Мойсейчик


Ансамбль «Беларусачкі»


Дуэт «Браво»

Воспитанники Слонимской детской школы искусств и Сеньковщинской детской школы искусств стали победителями и призерами V юбилейного международного конкурса-фестиваля искусств «Музыки свет», который проходил 13-15 марта в Минске.

В первый конкурсный день в номинации «народный вокал» диплом II степени завоевала Валерия Рожко. Дипломы лауреатов I степени достались Анастасии Бортко в номинации «народный вокал» и Артему Ваниславчику в номинации «академический вокал». Ребята стали также номинантами на Гран-при.

По итогам конкурса всех номинантов на Гран-при из разных вокальных номинаций высшую награду фестиваля получил Артем Ваниславчик.

В номинации «струнно-смычковые инструменты, виолончель, 13-14 лет» лауреатом признана Елена Снитко (педагог Светлана Снитко, концертмейстер Ульяна Мойсейчик).

В номинации «цимбалы» лауреатом I степени стала Анастасия Свекла, лауреатами II степени — Софья Ковчун, а также ансамбль «Беларусачкі» (Анастасия Свекла и Софья Ковчун).

В этой же номинации первое место жюри присудило учащемуся Сеньковщинской школы искусств Сергею Корзуну (учитель Вера Точеная, концертмейстер Полина Мищенко).

В номинации «смешанные ансамбли» лауреатами I стал дуэт «Браво» в составе Ивана Ильенкова и Софьи Радюк (руководитель Тамара Деконская и Людмила Богдан).

Все конкурсанты были награждены подарками, сертификатами, поучаствовали в мастер-классах жюри конкурса.

Дипломами за профессиональную подготовку лауреатов и Гран-при конкурса, бесценный труд и личный вклад в развитие искусства в Беларуси награждены их педагоги.

Жанна ИВАНОВА

ФОТОКОНКУРС «ВЕСНЫ ЛИКУЮЩЕЙ БЛАЖЕНСТВО»

«Газета Слонимская» совместно со студией красоты «Жемчужина» объявляет новый фотоконкурс — «Весны ликующей блаженство»

Главное условие конкурса — запечатлеть на фото и донести миру красоту окружающей живой природы, пробуждающейся жизни, весенних чувств и эмоций, где Вы — в унисон с весной


«Встречая весну». Фото Леона Утлика

Мы ждём ваших фотографии до 30 марта.

Обязательно укажите Ваше ФИО и контактный телефон и сопроводите свои фото названием или коротким описанием.

Фотографии принимаем на электронный адрес gs@gs.by, viber 8 029 133-04-21, сообщением в соцсетях «ВКонтакте» или «Одноклассники».

31 марта наш спонсор и коллектив «ГС» определят победителя, имя которого будет опубликовано в «Газете Слонимской» 1 апреля 2020 г.

Приз — сертификат от студии красоты «Жемчужина» на 50 рублей.

Юлия ТОЛКУН

СЛОНІМЦАЎ ЗАКЛІКАЮЦЬ ПРАГАЛАСАВАЦЬ ЗА ЛЮБІМАГА АРТЫСТА ЦІ АРТЫСТКУ

Сёлета Слонімскі драматычны тэатр святкуе юбілей — сваё 30-годдзе. Да гэтай даты тэатр рыхтуе шмат цікавых імпрэзаў для слонімцаў. Разам з тым ён заклікае жыхароў Слонімшчыны праявіць актыўнасць і выбраць свайго любімага артыста альбо артыстку.

Галасаванне праводзіцца на старонцы Слонімскага драматычнага тэатра ў «Аднакласніках». Як адзначылі ў тэатры, усё, што неабходна зрабіць – націснуць на кнопку «галасаваць».

Усяго прапанавана 12 кандыдатур, з іх толькі чатыры мужчыны. Галасаванне будзе працягвацца да 20 сакавіка ўключна. Пераможцу назавуць 27 сакавіка, у Міжнародны дзень тэатра, і ўзнагародзяць прызам глядацкіх сімпатый.

Максім СУДЗІЛОЎСКІ

КОТ, ЯКІ СЯДЗІЦЬ НА АКНЕ (ФОТАФАКТ)


Кот у Мастах

Кожная жывёліна нечым своеасаблівая. Ёсць свая адметнасць у афарбоўцы, ёсць і ў паводзінах.

Мне часта даводзіцца хадзіць па вуліцы Якуба Коласа ў Мастах і гэтак жа часта даводзіцца назіраць, як прыгожы пярэсты кот сядзіць на падваконні прыватнага дома. Уся незвычайнасць у тым, што ён сядзіць на знешняй частцы падваконня. Сядзіць выключна нерухома, не спрабуе саскочыць на зямлю, хоць тут невысока і для ката тое не перашкода. Даводзілася адзін раз бачыць, як гаспадыня адчыніла акно і ён павольна, з бязмернай кашачай годнасцю, пайшоў у дом.

Язэп ПАЛУБЯТКА
ФОТА АЎТАРА

ВОЙДИ В ИСТОРИЮ СВОЕГО ГОРОДА

В жизни каждого человека случаются как радостные, так и горестные события. Ведь именно из них и складывается хроника нашей жизни, которая может быть интересна не только нам, но и нашим потомкам. Поэтому давайте вместе создавать историю нашего Слонима.

Если вы хотите, чтобы издание «Отдушина» написало о вашей свадьбе, рождении ребенка, известило о смерти ближнего и напечатало некролог под рубрикой "Войди в историю своего города", пишите нам по адресу:
г. Слоним, ул. Красноармейская, 41, Тел.: 612-26-43, 2-90-00 (Тел/факс) .

ИСТОРИЯ

Дом — 200 рублей, пуд картофеля — 150 рублей

КАКИЕ ДОКУМЕНТЫ ХРАНИТ В СЕМЕЙНОМ АРХИВЕ СЕЛЬЧАНКА ЕВГЕНИЯ РАКУТЬ



Евгения Ракуть

В семейном архиве 90-летней Евгении Григорьевны Ракуть, которая живет в деревне Ярутичи Слонимского района, хранятся документы с прошлого века. Среди старинных документов находится приговор от 6 января 1895 года.

В документе говорится о том, что крестьяне деревни Ярутичи давали приговор земляку вступить в законный брак с сельчанкой и владеть всем движимым и недвижимым имуществом ее отца. «Мы нижеподписавшиеся крестьяне деревни Ярутичи Мариинской волости даем настоящий приговор крестьянину сей же деревни и волости Макарию Иванову Покало в том, что мы все поименованные сельским сходом крестьяне разрешаем Макарию Иванову Покало вступить в законный брак к девице крестьянке Александре Антоновне Хекало и владеть всем имуществом покойного Антона Хекало как движимым и равно и недвижимым, а именно во владении его — пол участка земли и постройки, какая остается после смерти Антона. Остальные сироты, т.е. Таклюся, Луцея, Антония и Зиновия должны находиться при Макарии и старшей сестре Александры, если они согласны будут при них жить. Макарий же обязан их воспитывать до возраста, а при выходе их замуж он обязан выдать каждой по одной овце и по одной осьмине ржи. Остальные сестры вышеупомянутые не могут противоречить против Макария, то есть не могут прогонять его. Макарий обязан оплатить весь долг покойного Антона в то время, когда будет владеть имуществом, обо всем этом мы все нижепоименованные свидетельствуем и даем сей приговор, и приговорившие при этом опекуны: Матвей Харута, Сань Шостак, Амвросий Вашута, и при этом и сельский сход: Матвей Покало, Федор Шестак, Егорий Ракуть, Павел Ракуть, Яков Шостак, Степан Блошко, Осип Пекарский, Валентий Пекарский, Ракуть Василий По неграмотности или иной нашей просьбе роспись Григория Хвескевича Сосновский сельский староста Дмитрий Микулич действительность настоящего приговора и собственноручные подписи Матвея..., Степана Ракутя и Григория Хвескевича Мариинской волости правление удостоверяет 3 февраля 1895 года.

Мариинский волостной старшина Н.Н. Мазюк, и волостной писарь Н. Михайлович».

В числе документов находится и справка, выданная исполнительным комитетом Сосновского сельсовета Слонимского района Брестской области от 15 сентября 1896 года г-ну Ракутю Григорию Петровичу, отцу Евгении Григорьевны, в том, что сгорело гумно збожжа. Справка выдавалась председателем сельсовета.


Хранится в семейном архиве Евгении Ракуть и ее свидетельство о рождении. Бланк документа написан на двух языках — немецком и польском. В метрике содержится информация о дне ее рождения, родителях и их вероисповедании. В свидетельстве указано, что оно выдано в 1944 году на год.

Сохранился у Евгении Григорьевны и акт о составлении описи и оценки движимого и недвижимого имущества ее дальнего родственника Макария Ивановича Покало, выданный в 1915 году августа 21 дня (в такой последовательности тогда указывалась дата документа). Акт составлял Мариинский Волостной старшина Слонимского уезда Гродненской губернии по личному ходатайству Макария Иванова Покало о составлении и оценке принадлежащего ему движимого и недвижимого имущества, которое находилось в деревне Ярутичи. «Руководствуясь циркулярным предписанием Гродненского губернатора по Слонимскому уезду от августа 21 дня 1915 года прибыть сего числа совместно с понятыми оценщиками Сосновского общества в усадебное место просителя Макария Иванова Покало, где в присутствии самого владельца и приглашенных нижеподписавшихся добросовестных оценщиков и свидетелей произвели опись всего движимого, недвижимого имущества посевов и лесного пространства, принадлежащих Макарию Ивановичу Покало.

В таблице описи указывалось наименование имущества, количество предметов, сумма. Урожай посевов выражался в пудах.

Так, у Макария Покало был один жилой дом, который стоил 200 рублей, один хлевной сарай стоимостью 150 рублей, овса было 20 пудов, которые стоили 20 рублей, ячменя 4 пуда — 24 рубля, 1 пуд картофеля был оценен в 150 рублей, пуд пшеницы — в 10 рублей и т.д.

Анна ВОЛОДАЩУК
anna@gs.by
ФОТО ИЗ АРХИВА «ГС»



АКТЪ.

1915 года Августа 21 дня. Я Марьинский Волостной Старшина Слонимскаго уезда Гродненской губ. вслѣдствіе личнаго ходатайства Макарія Иванова Покало о составленіи описи и оцѣнки принадлежащаго ему движимаго, недвижимаго имущества и посѣвовъ, находящихся въ им. дер. Ярутичахъ руководствуясь циркулярнымъ предписаніемъ Гродненскаго Губернатора по Слонимскому уезду отъ Августа 21 дня 1915 г. прибылъ сего числа совмѣстно съ понятыми оцѣнщиками Сосновскаго общества въ усадебное мѣсто просителя Макарія Иванова Покало гдѣ въ присутствіи самого владѣльца и приглашенныхъ нижеподписавшихся добросовѣстныхъ оцѣнщиковъ и свидѣтелей произвелъ опись всего движимаго недвижимаго имущества посѣвовъ и лѣсного пространства принадлежащихъ Макарію Иванову Покало.

при чемъ все имущество кромѣ посѣвовъ и лѣсного пространства, какъ видно изъ нижеслѣдующей описи, оцѣнено на сумму [illegible] пятнадцать р. [illegible] коп. Предполагаемый урожай посѣвовъ выражается въ пудахъ зерна, пудахъ соломы, пудахъ и пудахъ корнеплодовъ. Общее-же количество лѣсного пространства, состоитъ изъ дес. приблизительной стоимости по руб. за десятину, какъ видно изъ прилагаемыхъ перечетовъ.

№ по порядку.	Наименованіе предметовъ.	Количество предметовъ.	На сумму. Р.	На сумму. К.	Примѣчаніе.
1.	жилой домъ деревяной	1	200		
2	хлевной сарай	1	150		
3	овса [illegible]	20	20		
4	овса [illegible]	[illegible]	42		
5	ячменю [illegible]	4	24		
6	картошки	1	150		
7	пшеницы [illegible]	1	10		

ЗВЕСТКІ З МАСТОЎШЧЫНЫ

Аляксандр Крыштафовіч — невядомы паэт з Мастоўшчыны

Нядаўна патэлефанаваў сябра-медык з Мінска і без уступу кажа: «Не думаў, што на Мастоўшчыне нараджаюцца такія паэты, якія па значнасці на другім месцы пасля Сяргея Панізніка».


Аляксандр Крыштафовіч

«Сяргея Сцяпанавіча ведаю даўно, і, бывала, сустракаліся, але што за мастаўлянін, які так бойка піша? — Сябра не дае перадыху і чытае такія радкі: Жыві і мужней, Беларусь мая родная,/ Я шчасця жадаю табе».

Тыя радкі мяне не здзівілі, бо многа хто зараз клянецца ў любові да Бацькаўшчыны.

Адбываецца наступны дыялог:

— Ты чуў па Аляксандра Крыштафовіча?

Адказваю шчыра:

— Не!

— Я тут у стале знайшоў незапатрабаваную цікавую кніжку, дык высылаю табе. А наконт Аляксандра Уладзіміравіча, то не кожны з нас прыдатны быць класным медыкам і пісаць цудоўныя вершы.

Неўзабаве трымаю ў руках кніжку пад назвай «Гаючы квецень. Творы, напісаныя медыкамі». Гэта выдатна аформленая кніга выдадзеная даўно, у 2004 годзе. Укладальнік і рэдактар яе — знакаміты беларускі творца Васіль Якавенка. І сапраўды, той зборнік пачынаецца з вершаў Сяргея Панізніка, які свой жыццёвы шлях пачынаў як медык. А далей, як і казаў сябра, Аляксандр Крыштафовіч. І вачыма лаўлю шчырыя словы лірыкі:

Пад вакном ды маім
Расцвілі вяргіні.
Прыйдзі, мілы, пастаім
Надвячоркам сінім.

«Ах ты, любая мая,
Мілая Маруся.
На зыходзе бела дня
Да цябе з`яўлюся».
«Мой харошы ты, Іван,
Ванечка прамілы,
Я надзену сарафан
З вышыўкай яліны».

Падкупіла чыстае беларускае слова. Звяртаюся да біяграфіі.

Аляксандр Уладзіміравіч Крыштафовіч нарадзіўся ў вёсцы Букштава, што на Мастоўшчыне. Скончыў Азяранскую СШ і 1954 годзе стаў выкладаць фізіку і матэматыку ў Курылавіцкай і Кочынскай сямігодках. Фізік-матэматык нечакана мяняе жыццёвыя варункі, пераязджае ў Мінск і пачынае працаваць старшым прэпаратарам на кафедры акушэрства і гінекалогіі пединстытута. Праз год становіцца студэнтам лячэбнага факультэта гэтай навучальнай установы. Пасля яе сканчэння ў 1963 годзе вяртаецца на Мастоўшчыну, дзе дзевяць гадоў працуе галоўным урачом Курылавіцкай участковай бальніцы. З 1972 года ён на працы ў Рэспубліканскім клінічным шпіталі, што ў Бараўлянах пад Мінскам на пасадзе ўрача-анестэзіёлага хірургічнага аддзялення.Зараз той шпіталь носіць імя Пятра Машэрава.

Вось як проста і шчыра піша доктар-паэт пра гэтую ўстанову.

«Гэта што за гарадок?» —
У мяне спытаў дзядок.
Лес хваёвы і паляны...
Бараўляны, Бараўляны.

Аж з усёй Беларусі
Сюды людзі ехаць мусяць.
Медыцынскі цэнтр прызнаны —
Вось што значыць Бараўляны.

Як хваробу людзі маюць,
Тут здароўе папраўляюць.
Лечаць немач, лечаць раны —
І ўсё гэта Бараўляны.

Мне падаецца, што паэтычная творчасць спрыяла і прафесійнаму росту доктара. У 1984 годзе Аляксандр Уладзіміравіч арганізаваў і ўзначаліў аддзяленне анестэзіялогіі і рэанімацыі гэтага шпіталю. На час выхаду кнігі, ужо на пенсіі, ён працаваў урачом-ардынатарам.

Аднак вернемся да вершаў.

... Ты прыўзнятаю рукою
Адкрывала даль, абшары:
«Так і пойдзем мы з табою
Да сваёй вялікай мары.
....
Будзем жыць з табою ў згодзе,
Будзем жыць з табою міла.
Тваё сэрца, мой Валодзя,
Да свайго я прытуліла».

Сіхнуў дождж, няма грымотаў,
Біць маланка перастала.
І на небе з-пад аблокаў
Ярка сонейка заззяла.

У зборніку змешчана толькі невялічкая колькасць з напісанага паэтам. Вельмі паказальны наступны верш.

Двое

Дык як жа нам з тропу не збіцца,
Прадбачлівасць дзе нам узяць?
Разумны дык любіць вучыцца,
А дурань — усіх павучаць.

Разумны заўсёды ў дарозе,
Дзе штось зведаць, спазнаць.
А дурань сядзіць на парозе,
Гатовы ўказанні даваць.

Не прамінаў паэт і сучасныя варункі жыцця.

Перайначылася
Гаспадарка, знемагла,
Рынак ёй кіруе.
А на рынку галава
Менш хваста каштуе.

Калі пазнаёміўся з невялікай кнігай невядомага мне аўтара, падумалася: гэта вялікая спадчына, і не варта яе губляць.

Язэп ПАЛУБЯТКА



Янечка-верацяно


МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

Больш прыгожай і працавітай дзяўчыны, чым Яня Конаўка, не было не толькі ў іхніх Сасноўках, але і ў навакольных вёсках. Была яна невысокага росту, спрытная, з чорнымі вачамі і такімі ж чорнымі да пояса косамі. Твар белы, як усё адно памыты малаком. За спрыт і рухавасць дзяўчыну называлі Янечка-верацяно, бо ўсюды паспявала, з усім спраўлялася. У далёкія 60-я гады моладзі ў вёсках было шмат, і, мабыць, не знайшлося б такога хлопца, які на вяселлях ды вечарынках не стараўся запрасіць яе на танец. І дадому праводзіць ахвочых было вельмі шмат. Але Янечка, як казалі ў вёсцы, перабірала. Калі вярнуўся з арміі Сцяпан Кавальскі, то яны сталі неразлучныя.

— Ну і кавалера ж сабе выбрала! — казалі вясковыя дзяўчаты. — Ты такая прыгожанькая, спрытная, а ён нібы які бусел — высокі, цыбаты і з твару не вельмі прыгожы.

— Што вы разумееце? — спыняла іхнія кпіны Янечка. — Сцяпан, можна сказаць, мне яшчэ ніхто, а ўжо і дроў нам з мамай навазіў, на цэлую зіму хопіць, папілаваў ды пасек. І атаву сенаваць памог. Ён надзейны ў жыцці, працавіты, а што іншыя прыгожыя, то які толк з іхняй прыгажосці. Сцяпан талковы ў жыцці. Ведаеце ж, што мы з мамкай удзвюх жывем, памагчы не было каму, а цяпер ёсць.

Вяселле згулялі ў пачатку восені, калі вяскоўцы пачыналі капаць бульбу. Янеччына маці старая Ядвіня была вельмі рада, што Сцяпан перайшоў жыць у іхнюю хату, іншымі словамі, стаў прымаком. Маладая жонка не захацела ісці жыць у іхнюю хату, дзе разам з бацькамі былі яшчэ тры браты і адна сястра. Не паглядзеў, што хата ў Ядвіні, так бы мовіць, на падпорках, старая, а ўзімку, як пачнецца завея, то ў ёй проста не ўседзець. Вядома ж, гаспадар не вярнуўся з вайны, каму тут яе рамантаваць?

Сцяпан неўзабаве паднавіў яе як мог, але маладым вельмі хацелася пабудаваць сваю, новую ды дабротную. І яны вырашылі паехаць у заробкі на Поўнач. Пашпартоў тады вяскоўцам не давалі, але Сцяпану неяк удалося, як казалі ў вёсцы, выправіць дакументы і сабе, і жонцы. Не пускала Ядвіня, плакала, але яны ўгаварылі:

— Заробім грошай і прыедзем. Затое хату новую пабудуем, прыгожую, цёплую. Чакай нас... А каб было лягчэй, карову прададзім, бо адна насенаваць не здолееш. Пакінем толькі свіней ды курэй.

Згадзілася Ядвіня, бо што ёй было рабіць? Чакала дзяцей з надзеяй, што ўсё будзе добра.

Так яно і сталася. Некалькі гадоў прабылі на Поўначы Янечка са Сцяпанам і пасля прыезду адразу ўзяліся будаваць хату. Прыхваткамі, канечне, бо трэба ж было хадзіць на калгасную работу, але не за доўгім часам на сядзібе Конаўкаў побач са старой вырасла новая хата. Не хата — дом, самы лепшы ў Сасноўках.

І пачалі ў ёй нараджацца дзеткі. Спачатку два сыночкі, потым дзве дачушкі. Ядвіня гадавала іх і радавалася такому шчасцю, што нарэшце дачакалася сваіх маленькіх, як яна казала жураўлікаў.

І выгадавала. Памерла толькі тады, калі самая меншая Сабіна скончыла сярэднюю школу. Бацькі стараліся, каб усе дзеці атрымалі адукацыю. Сыны сталі інжынерамі, а дочкі — медсёстрамі. Як казалі ў вёсцы, усе зачапіліся ў гарадах. Васіль і Казік засталіся ў Мінску, працавалі на заводзе, а дзяўчаты Іра і Сабіна — у Маладзечне. Усе пажаніліся ды замуж павыходзілі, атрымалі кватэры. Янечка са Сцяпанам жылі ды радаваліся. Трымалі вялікую гаспадарку, каб дапамагчы дзецям і мясам, і ўсім астатнім.

Але ж няўмольная старасць падкралася і да іхняга парога. Першым занямог Сцяпан: сталі балець ногі, не слухаліся рукі. А незадоўга і Янечка-верацяно, якой, здавалася, і зносу не будзе, пачала скардзіцца на боль у паясніцы.

Гаспадарку яны збылі і яшчэ некалькі гадоў трымалі пару курыц і гарластага пеўня.

Але аднойчы, у самым канцы лета, паклікаўшы дадому ўсіх дзяцей, Сцяпан мовіў:

— Не можам мы ўжо самі сябе дагледзець, патрэбна ваша падтрымка. Забярыце хто-небудзь у сваю сям`ю. Хто забярэ, таму застануцца і грошы, што маем, і хата, і ўсё астатняе...

— Ну, бацька, ты нам залатыя горы абяцаеш! — узвілася Іра. — Хату яшчэ прадаць трэба, калі хто купіць. А грошай у вас нябось не мільёны. За іх ды даглядаць двух старых, карміць іх, а неўзабаве, прабачце, і гаршчкі выносіць... Не, я не вазьму!

— Ірачка... — спрабаваў уставіць сваё слова яе муж Яўхім, але жонка адразу, так бы мовіць, заткнула яму рот:

— Сваімі бацькамі будзеш камандаваць, а тут маўчы.

І ён замоўк. Яўхім, спагадлівы і добры, згодны быў, каб цесць і цешча жылі ў іх, але хіба жонка дазволіць?

Другая дачка і сыны таксама наадрэз адмовіліся.

— Ну дык што ж, нам у дом састарэлых прасіцца? — з адчаем мовіў Сцяпан. — На чужыя рукі, на чужую пасцель... Нядобра гэта, дзеткі, грэх вялікі. Чацвёра дзяцей выгадавалі, і ва ўсіх сэрцы халодныя як лёд.

Янечка не мовіла ні слова. Яна залівалася слязамі, і ў некалі прыгожых вачах застыла такая туга і боль, што не выказаць словамі.

— Нас жа ў вёсцы засмяюць, — працягваў далей Сцяпан. — Лічыліся добрай сям`ёй, а тут вунь што выходзіць...

Да глыбокай ночы судзілі ды радзілі сыны ды дочкі і нарэшце вырашылі: даглядаць бацькоў па месяцы. Але не абодвух разам, а па аднам. Іншымі словамі, разлучалі Сцяпана і Янечку назаўсёды.

І разлучылі. Жыццёвыя цяжкасці не разлучылі, а родныя дзеткі змаглі. Толькі на Радаўніцу па слёзнай просьбе прывозілі старых на бацькоўскія магілы, толькі тады на некалькі гадзін змаглі яны абняцца і моўчкі выплакаць горыч разлукі....

Першай памерла Янечка, але Сцяпана не звазілі развітацца з любімай жоначкай. Іра, у якой тады жыў Сцяпан, не дазволіла:

— Тут і так клопатаў шмат, а яшчэ са старым валэндайся!

Не дажыўшы да саракавін, за сваёй Янечкай адправіўся і Сымон.

Сустрэнуцца там, на нябёсах, дзе іх ужо ніхто не разлучыць...

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

Афиша

Слонимский драмтеатр

22 марта, воскресенье
Спектакль для детей «Золотой цыпленок», начало в 12.00, цена 4 руб.

Слонимский центр культуры

20 марта, пятница
Праздничное мероприятие, посвящённое Дню работников жилищно-коммунального хозяйства «Примите наши поздравления!», начало в 15.00

Кинозал

18 марта, среда
15.00 «Вперёд» 3D (США, 6+, мультфильм, 1.42)
17.00 «Остров фантазий» 2D (США, 16+, ужасы, 1.49)
19.00, 21.00 «Бладшот» 2D (США, 16+, фантастика, 1.49)

19 марта, четверг
15.00, 18.15 «Тролли. Мировой тур» 3D (США, 6+, мультфильм, 1.30)
16.30 «Вперёд» 3D (США, 6+, мультфильм, 1.42)
19.45, 21.40 «Бладшот» 2D (США, 16+, фантастика, 1.49)

20 марта, пятница
11.00 «Вперёд» 3D (США, 6+, мультфильм, 1.42)
17.30 «Тролли. Мировой тур» 3D (США, 6+, мультфильм, 1.30)
19.00, 21.00 «Бладшот» 2D (США, 16+, фантастика, 1.49)

21 марта, суббота
12.00, 17.15 «Тролли. Мировой тур» 3D (США, 6+, мультфильм, 1.30)
13.40 «Вперёд» 3D (США, 6+, мультфильм, 1.42)
15.30 «Авантюры Прантиша Вырвича» 2D (Беларусь, 12+, история, 1.40)
19.00, 21.00 «Бладшот» 2D (США, 16+, фантастика, 1.49)

22 марта, воскресенье
12.00, 17.15 «Тролли. Мировой тур» 3D (США, 6+, мультфильм, 1.30)
13.40 «Вперёд» 3D (США, 6+, мультфильм, 1.42)
15.30 «Авантюры Прантиша Вырвича» 2D (Беларусь, 12+, история, 1.40)
19.00, 21.00 «Бладшот» 2D (США, 16+, фантастика, 1.49)

Главный редактор Николай Николаевич Кононович

Учредитель
Анна Павловна ВОЛОДАЩУК

ГАЗЕТА ВЫХОДИТ НА РУССКОМ И БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКАХ

Телефоны редакции:
Velcom: 8-029-133-04-21
факс: 8 (01562) 2-90-00
звонить с 9.00 до 18.00
Skype — gazslon

Для корреспонденции: 231799, г. Слоним, ул. Красноармейская, д.41
Юридический адрес: г. Слоним, ул. Красноармейская, 41

Регистрационное удостоверение №65 от 05.03.2009 года выдано Министерством информации Республики Беларусь. Свидетельство о госрегистрации УП "Газета Слонимская" ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от 03.04.2003 г.

Авторы опубликованных материалов отвечают лично за подбор и достоверность фактов, их точка зрения может не совпадать с мнением редакции. Редакция не ведет переписки с читателями и оставляет за собой право не рецензировать и не возвращать рукописи. Редакция не несёт ответственности за содержание рекламы.

Свободная цена

Тираж номера 3010 экз.

Время подписания к печати по графику 17 марта 2020 года 17:00

РЕКЛАМНАЯ СЛУЖБА
8(044) 715-90-03
8(044) 762-48-39; 8(044) 715-90-03
ул. Красноармейская, 41
e-mail: gs@gs.by, gazslon@gmail.com

Объем — два условных печатных листа.
Газета отпечатана в ГОУПП "Гродненская типография", Гродно, ул. Полиграфистов, 4. индекс 230025
ЛП №02330/39 от 27.03.2014
Заказ № 1395

Распространяется с газетой "Газета Слонимская" по подписке и в розницу по Республике Беларусь

ISSN 1991-3362



